Источник: "Архівы і справаводства" - № 1, 2012-01-20





# МАТЭРЫЯЛЫ ДА БІЯГРАФІІ ІГНАТА КАНЧЭЎСКАГА Ў АРХІЎНЫХ ЗБОРАХ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ

**Ігнат Канчэўскі** (1896–1923) – выбітны беларускі філосаф, паэт, публіцыст, каапhouseholder і грамадскі дзеяч – пражыў кароткае жыццё і пакінуў невялікую, але надзвычай адметную творчую спадчыну, якая, на жаль, у выглядзе адзінага тэкставага корпуса не захавалася.

Пры жыцці І. Канчэўскі паспеў выдаць толькі адну кнігу – вядомае эсэ **"Адвечным шляхам: Даследзіны беларускага светагляду"** (Вільня, 1921; пад псеўд. *Ігнат Абдзіраловіч*). У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў **Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН)** захаваўся першы, **чарнавы варыянт** гэтага твора, які, мяркуючы па аўтарскіх пазнаках, пісаўся ў маі 1921 г. і пачаткова меў назву "Эскізы будучыны"[1]. Рукапіс мае нямала разыходжанняў з друкаваным варыянтам, утрымлівае ў сабе і асобныя фрагменты, што не ўвайшлі ў канчатковы тэкст, але добра адлюстроўваюць ход думак І. Канчэўскага пад час працы над эсэ.

Частка паэтычнай спадчыны І. Канчэўскага захоўваецца ў **Бібліятэцы Акадэміі навук (БАН) Літвы**. Адпаведная **архіўная справа**[2] уяўляе з сябе невялікую падборку вершаў, сабраных і перапісаных яго братам, заходнебеларускім рэвалюцыйным дзеячам **Арсенем Канчэўскім** (1901–1931), для публікацыі ў адным з віленскіх выданняў (а не «зборнік "Паэзія"», як напісана ў даведніку "Беларускія пісьменнікі"[3]). Разам з вершамі захаваўся **ліст у выдавецтва**, у якім А. Канчэўскі дае высокую ацэнку Ігнатавай паэзіі і прызнаецца, што *"шмат палажыў працы, каб устанавіць гэтыя радкі з нячытэльных і чарнавых заметак"*[4]. Гэтыя вершы І. Канчэўскага ("Так глыбока…", "Сакавік", "У сьвяточны дзень", "Не хавайце мяне ў цмантары…", "Па сьвятой зямлі – Яго сьвятыя ногі…", "Чэрвень красаваў маёвымі кветкамі…", "Шэ-



Віктар Жыбуль. Матэрыялы да біяграфіі Ігната Канчэўскага ў архіўных зборах Беларусі і Літвы

рыя вокны сьвецяцца матавым сьветам...") былі апублікаваны ўжо ў наш час **Андранікам Антанянам**[5].

У **Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ)** захоўваюцца **некалькі матэрыялаў**, якія датычацца біяграфіі Ігната Канчэўскага і гісторыі яго сям'і. Так, напрыклад, у **фондзе** культурнай дзяячкі **Веры Ніжанкоўскай** маецца вялікая **радаводная табліца**, складзеная самой фондаўтваральніцай[6]. Адтуль мы даведваемся, што дзед Ігната і Арсеня, таксама **Ігнат Канчэўскі**, меў брата **Адама**[7]. Абодва яны былі праваслаўнымі святарамі. Дачка Адама **Алена** (памерла ў 1908 г.) выйшла замуж за паштмайстра **Мікіту Уласава**, нарадзіўшы дачку **Лізавету** (1867–1954) і сына **Аляксандра** (1874–1941), будучага выдаўца **"Нашай Нівы"**, публіцыста, мемуарыста і грамадскага дзеяча. Такім чынам, Ігнат Канчэўскі і Аляксандр Уласаў даводзіліся адзін аднаму **траюраднымі братамі**. У сваю чаргу, Лізавета стала жонкай археолага і гісторыка **Андрэя Сніткі** (1866–1920). Іх дачка **Вера** (1901–1998) выйшла замуж за філолага і грамадскага дзеяча **Браніслава Тарашкевіча** (1892–1938), а другі раз – за настаўніка **Уладзіслава Ніжанкоўскага** (1904–1943). Ёсць, праўда, у табліцы і некаторыя недакладнасці, якія мусяць быць улічанымі пры спасылках на гэты дакумент. Так, напрыклад, год смерці Ігната Канчэўскага памылкова напісаны "1926" замест "1923".




*Уладзімір і Соф'я Канчэўскія, бацька і маці Ігната і Арсеня*

Згаданая табліца не з'яўляецца поўнай, аднак некаторыя дадатковыя звесткі пра род Канчэўскіх ёсць у **лістах Фёдара Якімавіча Канчэўскага** (1901 – пасля 1977), Ігнатавага стрыечнага брата, былога ўдзельніка заходнебеларускага падпольнага руху, да літаратуразнаўцы і пісьменніка **Уладзі-**

**міра Калесніка**, які даследаваў жыццё і творчасць І. Канчэўскага, збіраў пра яго біяграфічныя звесткі. Так, з ліста ад 7 лістапада 1975 г. даведваемся пра тое, што ў Фёдара былі браты **Барыс** (1893–1914) і **Дзмітрый** (1896–1933) – адпаведна, **стрыечныя браты** Ігната Канчэўскага[8]. На просьбу даследчыка сваяк віленскага філосафа распавёў і пра некаторыя прыватныя ўзаемаадносіны ў сям'і – напрыклад, пра знаёмства Ігната з будучай жонкай і непрыманне яе з боку ягонай маці[9]. Акрамя таго, Ф. Канчэўскі ўдакладніў факты ўдзелу членаў сям'і ў заходнебеларускім падпольным руху, згадаў віленскія мясціны, дзе адбываліся канспіратыўныя сходы (Новы Свет, вул. Паплаўская). Дарэчы, у біябібліяграфічным даведніку "Беларускія пісьменнікі" Фёдар Якімавіч Канчэўскі памылкова названы Фёдарам Ігнатавічам, прычым не стрыечным братам, а дзядзькам Ігната. Хутчэй за ўсё, гэта адбылося з прычыны паспешлівасці пры ўкладанні даведніка, калі ў друк быў пададзены непапраўлены варыянт (арыгінал захоўваецца ў **асабістым фондзе У. Калесніка** ў БДАМЛМ[10]).

У **фондзе № 3 (Калекцыя Беларускага музея імя Івана Луцкевіча)** адзін з дакументаў быў памылкова прaанатаваны як рукапіс І. Канчэўскага, хоць насамрэч не належыць яго пяру. Гэта **ліст да Браніслава Тарашкевіча** ад 16 лютага 1919 г. на лацінцы, падпісаны *"Ancia Halubianka"*[11]. Ігнат Канчэўскі і сапраўды падпісваў свае вершы псеўданімам *Ганна Галубянка*, аднак ці многія ведаюць пра яго паходжанне? Абодва псеўданімы Ігната Канчэўскага – **Ігнат Абдзіраловіч** і **Ганна Галубянка** – з'яўляюцца свайго кшталту культурнымі запазычаннямі. Калі першы ўзяты з літаратуры (Ігнатам Абдзіраловічам зваўся галоўны герой аповесці М. Гарэцкага "Дзве душы", 1919 г.), то другі – непасрэдна з жыцця. Анцяй Галубянкай (Ганнай Голуб) звалі забытую сёння дзяячку беларускага руху, сяброўку Б. Тарашкевіча, сястру вядомай у віленскіх колах доктаркі **Марыі Голуб-Бучынскай**. На самым пачатку 1920-х гг. Анця Галубянка заўчасна пайшла з жыцця, і, напэўна, у па-



Віктар Жыбуль. Матэрыялы да біяграфіі Ігната Канчэўскага ў архіўных зборах Беларусі і Літвы

мяць пра яе І. Канчэўскі і ўзяў сабе псеўданім. Такім чынам, у БДАМЛМ захоўваецца ліст да Б. Тарашкевіча, напісаны не І. Канчэўскім, а рэальнай Анцяй Галубянкай (Ганнай Голуб) – натуральна, ад жаночага імя.



*Ігнат Канчэўскі*

Асцярожнымі трэба быць даследчыкам і з дакументамі, дзе прозвішча Канчэўскі пазначана без ініцыялаў: гаворка можа весціся як пра **Ігната**, так і пра **Арсеня**. Так, напрыклад, у **бюлетэні Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны** (18 верасня 1919 г.) Канчэўскі згадваецца як выбраны ў Раду прадстаўнік ад Саюзу Каапэрацыі[12] – маецца на ўвазе відавочна Ігнат, бо Арсень у каапераціі на той час яшчэ не працаваў.



*Арсень Канчэўскі*

Цяжэй было ўдакладніць, хто ж з братоў Канчэўскіх сустракаецца ў дакументах, звязаных з выбарамі ў Польскі сейм і Сенат у 1922 г. У папярэдніх спісах кандыдатаў па Свянцянскім павеце пазначана *"Канчэўскі – Дукшты"*[13], гэтае прозвішча згадваецца і ў спісе пад загалоўкам *"Паліт[ычная] кам[ісія] і сябры К[амітэ]ту"*[14]. Пазнака *"Тар."* сведчыць пра тое, што Канчэўскі быў прапанаваны на месца кандыдата Браніславам Тарашкевічам (але, урэшце, не зацверджаны). А запаўняліся спісы пераважна рукой Антона Луцкевіча, які з'яўляўся тады старшынёй Прэзідыуму Цэнтральнага Выбарчага Беларускага Камітэта (Тарашкевіч быў віцэ-старшынёй).

Той факт, што ў 1922 г. каапаратар з прозвішчам Канчэўскі нейкі час жыў у аддаленым ад Вільні мястэчку Дукшты,

пацвярджаецца ў **"Споведзі" Ларысы Геніюш**, дзе аўтарка піша пра шлях свайго мужа Янкі ў Чэхаславакію, куды той быў накіраваны на навучанне Беларускай Школьнай Радай у Вільні. Але спачатку ён мусіў прабрацца ў Літву і атрымаць там візу, і Б. Тарашкевіч яго *"направіў да нейкага Канчэўскага ў Дукштах, беларускага каапэратара, які па ланцужку так перасылаў людзей"*[15]. Матэрыялы захаваных у Вільні **кніг рэгістрацыі жыхароў** сведчаць, што Ігнат Канчэўскі ў 1922 г. не пакідаў родны горад, а вось Арсень сапраўды ў 1922 – 1923 гг. па некалькі тыдняў ці нават месяцаў праводзіў то ў ваколіцах Вільні, то ў Дукштах і Опсе, куды выязджаў у якасці інструктара каапэрацыі (у гэтай галіне ён працаваў з канца 1919 па 1924 г.).



*Ігнат Канчэўскі ў труне. Красавік 1923 г.*

Цікавасць уяўляюць **водгукі на смерць І. Канчэўскага**, пакінутыя яго сучаснікамі: некралогі **А. Л. (Антона Луцкевіча)**[16] і **Клаўдзія Дуж-Душэўскага**[17], а таксама кароткая нататка **Максіма Гарэцкага**, дзе, сярод іншага, згадваецца, што пахаваны І. Канчэўскі *"на Вайсковых Могілках, на Антокалі"* (на жаль, магілы Ігната і яго бацькоў не захаваліся.) Ніжэй – зроблены пазней запіс **Леанілы Чарняўскай** (жонкі М. Гарэцкага) пра трагічны лёс Арсеня Канчэўскага, які *"памёр у верасьні 1931 г. Утонуў у Чорным моры. Яго ўрачыста хавалі ў Мінску на Доўгабродскіх могілках"*[18].

Некаторыя матэрыялы **сямейнага архіва Канчэўскіх** (у тым ліку Ігнатавы фотаздымкі, рукапіс яго ўспамінаў пра школьныя гады "З недалёкага", датаваны 21 красавіка 1921 г.) захоўваюцца ў іх сваячкі **Тамары Юстыцкай**, якая жыве ў Вільні. На сённяшні дзень паміж ёю і дырэктарам БДАМЛМ **Ганнай Запартыкай** наладжана плённая перапіска – так што,

магчыма, рана ці позна фонды архіва – музея могуць папоўніцца новымі дакументамі.

Сёлета споўнілася **115 гадоў** з дня нараджэння Ігната Канчэўскага. Гэтая дата – чарговая нагода падумаць пра выданне кнігі, якая аб'яднала б пад адной вокладкай усю выяўленую на гэты момант філасофскую, публіцыстычную, паэтычную, літаратурна-крытычную спадчыну выдатнага асветніка, а таксама дакументаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю гэтай асобы. І, вядома ж, вялікую ролю ў падрыхтоўцы такога выдання адыгралі б матэрыялы, што зберагаюцца ў фондах архіўных сховішчаў.

---

[1] ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 27.

[2] БАН Літвы, аддз. рукап. Ф. 21. Адз. зах. 212.

[3] Калеснік У.А. Канчэўскі Ігнат // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўнік. У 6 т. Т. 3. Мн.: БелЭн, 1994. С. 138.

[4] БАН Літвы, аддз. рукап. Ф. 21. Адз. зах. 212. Арк. 19.

[5] Канчэўскі І. Вершы зь віленскага архіву / публ. А. Антаняна // Наша Ніва. 1998. 8 ліст.

[6] БДАМЛМ. Ф. 443. Воп. 1. Адз. зах. 4. Арк. 33 адв. – 51.

[7] Тамсама. Арк. 41 адв.

[8] Тамсама. Ф. 161. Воп. 3 (неапрац.). Адз. зах. 28.

[9] Тамсама.

[10] Тамсама.

[11] Тамсама. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 227. Арк. 10.

[12] Тамсама. Адз. зах. 154. Арк. 1.

[13] Тамсама. Адз. зах. 209. Арк. 16.

[14] Тамсама. Арк. 19.

[15] Геніюш Л. Збор твораў. У 2 т. Т. 2. Проза, лісты / уклад., прадм. і камент. М. Скоблы. Мн.: Лімарыус, 2010. С. 22.

[16] БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 110. Арк. 47.

[17] Тамсама. Адз. зах. 56. Арк. 145.

[18] Тамсама. Ф. 426. Воп. 2. Адз. зах. 39.

***Віктар Жыбуль***
*вядучы навуковы супрацоўнік БДАМЛМ*